УДК [355.232+374.72:355](476.4-25)(091) «1920/1922»

# ЧЫРВОНААРМЕЙСКІ ЎНІВЕРСІТЭТ У МАГІЛЁВЕ Ў 1920–1922 ГАДАХ: УТВАРЭННЕ, СТРУКТУРА І ДЗЕЙНАСЦЬ

*Барнюк Аляксей Сяргеевіч*
навуковы супрацоўнік Цэнтра гісторыі навукі і архіўнай справы НАН Беларусі
(г. Мінск, Рэспубліка Беларусь)

*У перыяд 1920–1921 гадоў у Магілёве існаваў Чырвонаармейскі ўніверсітэт. Дадзеная навучальная ўстанова амаль не згадваецца ў гістарыяграфіі. Прычым гэта навучальная інстытуцыя з'яўлялася першай ваеннай навучальнай установай савецкага тыпу на тэрыторыі Беларусі.*

У перыяд грамадзянскай вайны і вайны з Польшчай Чырвоная Армія мела вострае запатрабаванне ў ваенных спецыялістах.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

Сярод ваенных спецыялістаў, неабходных для Чырвонай Арміі, асаблівая ўвага надавалася палітычным кіраўнікам і палітработнікам асветы. Для таго каб ліквідаваць недахоп у дадзеных спецыялістах, на кантралюемай камуністычнымі уладамі тэрыторыі пачалося ўтварэнне спецыяльных ваенных навучальных ўстановаў – чырвонаармейскіх універсітэтаў. Падобная навучальная ўстанова – Чырвонаармейскі ўніверсітэт пры палітычным аддзеле 16-й арміі – існавала ў Магілёве з ліпеня 1920 па красавік 1922 года [4, с. 195].

Створаны Чырвонаармейскі ўніверсітэт пры палітаддзеле 16-й арміі быў па прыкладзе Петраградскага чырвонаармейскага ўніверсітэта імя Мікалая Талмачова. Петраградская ўстанова была створана раней, у 1919 годзе, як Чырвонаармейскі настаўніцкі інстытут. У сакавіку 1920 года гэты інстытут быў пераўтвораны ва ўніверсітэт [3, с. 82–83].

У Петраградскім ўніверсітэце існавалі пяць факультэтаў: палітычны, асветны, мастацтваў, тэхнічны і сельскай культуры [3, с. 83]. На гэтых факультэтах рыхтавалі спецыялістаў па накірунках для арміі, а таксама палітычных работнікаў для працы з вайскоўцамі і мясцовым насельніцтвам, ліквідацыі непісьменнасці сярод грамадзянскіх жыхароў. Таксама ва ўніверсітэце рыхтавалі спецыялістаў арганізацыі працы для тылавых армій. З пачатку сакавіка 1921 года ўстанова пераўтварылася ў акружны інструктарскі інстытут [3, с. 83].

Чырвонаармейскі ўніверсітэт пры палітаддзеле 16-й арміі быў утвораны 1 ліпеня 1920 года шляхам аб'яднання дывізійных школ пры палітычных аддзелах 8-й і 17-й дывізій гэтай арміі [1]. Ва ўніверсітэце былі створаны наступныя аддзяленні: арганізацыйна-палітычнае, сельскагаспадарчае, харчовае, транспартнае, школьна-бібліятэчнае, аддзяленне мастацтваў [1]. Таксама да ўніверсітэта належала вячэрняя школа, вучэбная гаспадарка і драматычная студыя. Выдавалася газета «Известия КРУНТа» (КРУНТ – "Красноармейский университет") і часопіс «Красная кузница», аб чым захаваліся дакументы ў Дзяржаўным архіве грамадскіх аб'яднанняў Магілёўскай вобласці [1]. Таксама навучэнцаў прыцягвалі да розных адміністрацыйных і партыйных мерапрыемстваў, кампаній: па ўзмацненні савецкай улады, па дапамозе галадаючым Паволжа, па барацьбе з антысаветызмам. Таксама вядомы факт накіравання курсантаў на Данбас для ўдзелу ў падобных кампаніях мясцовых савецкіх органаў [1].

Універсітэт спыніў сваю дзейнасць у красавіку 1922 года, пасля аб'яднання ўніверсітэта з Петраградскім акружным інстытутам, у выніку чаго былі арганізаваны Вышэйшыя ваенныя курсы (у будучым Ваенна-палітычная акадэмія, зараз Ваенны ўніверсітэт Міністэрства абароны УС РФ імя Аляксандра Неўскага) [3, с. 83]. За час свайго існавання ўніверсітэт падрыхтаваў 69 паліткіраўнікоў і 437 палітпрасветработнікаў [1].

Як бачна, структура Магілёўскага чырвонаармейскага ўніверсітэта была падобная да галаўной установы ў Петраградзе, хаця і мела шэраг адрозненняў у будове. Так, у Магілёўскім чырвонаармейскім універсітэце быў зроблены большы ўпор на тэхнічны накірунак працы, звязаны з тэхнікай і сельскай гаспадаркай, а таксама а таксама пачаў працаваць школьна-бібліятэчны факультэт для асветніцкай працы. Гэта тлумачылася, верагодна, тым, што будучыя палітработнікі павінны былі часта працаваць на месцах з вясковым насельніцтвам і быць не толькі праваднікамі палітыкі камуністычнай партыі, але і дапамагаць гэтаму насельніцтву ў будаўніцтве гаспадаркі, разбуранай войнамі, і быць праваднікамі асветы і ліквідатарамі непісьменнасці.

У 1922 годзе адбылося зліццё Чырвонаармейскага ўніверсітэта з Петраградскім інстытутам, якое можна патлумачыць шэрагам фактараў: спыненнем ваенных дзеянняў, цэнтралізацыяй армейскага навучання, а таксама агульнай тэндэнцыяй – пачалася адмова ад спроб стварэння абсалютна новых, некласічных форм адукацыі. Таксама гэта праявілася і ў сферы ваеннай адукацыі: стала зразумелым, што будаваць армію можна толькі маючы добра падрыхтаваных спецыялістаў. Калі ў перыяд ваенных дзеянняў патрабавалася выпускаць спецыялістаў максімальна хутка, то ў мірны час праблема стала відавочнай.

Чырвонаармейскі ўніверсітэт пры палітаддзеле 16-й арміі быў спробай стварэння вышэйшай навучальнай установы на тэрыторыі Беларусі. Безумоўна, назваць яго вышэйшай на-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вучальнай установай у сучасным разуменні гэтага тэрміна немагчыма, але для таго перыяду ў гісторыі дадзеныя ВНУ ўспрымаліся як вышэйшыя навучальныя ўстановы. Так, у першым нумары «Прац БДУ» за 1922 год была надрукавана «Университетская летопись» за аўтарствам прафесара Фёдара Турука [6, с. 175–208]. У гэтым артыкуле была апісана гісторыя станаўлення вышэйшай адукацыі на Беларусі, якая канчалася ўтварэннем Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Сярод устаноў, якія папярэднічалі стварэнню БДУ, ён прыгадаў і Чырвонаармейскі ўніверсітэт у Магілёве [6, с. 181]. Вядома таксама, што ў Магілёве яшчэ ў часы да падзей рэвалюцый 1917 года прапаноўвалася стварыць універсітэт для Паўночна-Заходняга краю якая не сустрэла на той момант падтрымкі ўладаў Расійскай імперыі [6, с. 178]. Цалкам верагодна, што месца размяшчэння Чырвонаармейскага ўніверсітэта не з'яўляецца ў такой сітуацыі выпадковасцю: як вядома, пралетарскія навучальныя ўстановы павінны былі размяшчацца не ў сталіцах, а ў мясцовых цэнтрах. Верагодна, дарэвалюцыйныя і паслярэвалюцыйныя ідэі сумяшчаліся, што ў сукупнасці ўплывала на выбар месца стварэння ўстановы. Таксама нельга не заўважыць, што гэтая ўстанова з'яўлялася першай савецкай вайсковай навучальнай установай на тэрыторыі Беларусі (хаця ў той момант Магілёў знаходзіўся ў складзе РСФСР) – савецкая форма ваеннай адукацыі на тэррыторыі Беларусі пачала развівацца зноў толькі з 1926 года, калі была створана ваенная кафедра БДУ [5, с. 28].

### Спіс выкарыстанай літаратуры


1. Барцулёва, С. В. Деятельность партийных учебных заведений Могилевской области в начале 1920-х годов [Электронный ресурс] / С. В. Барцулёва. – // Режим доступа: https://www.mogjust.gov.by/governance/str/archiving/interesting/954-deyatelnost-partijnykh-uchebnykh-zavedenij-mogilevskoj-oblasti-v-nachale-1920-kh-godov. – Дата доступа: 24.01.2022.
2. Богданов, А. А. О пролетарской культуре 1904–1924 / А. А. Богданов. – Л.–М. : Книга, 1924. – 344 с.
3. Бориснев, С. В. Главная кузница военно-политических кадров России. К столетию образования Военного университета Министерства обороны РФ / С. В. Бориснев // Военно-исторический журнал. – 2019. – № 11. – С. 82–89.
4. Красноармейский университет // Могилев : энцикл. справ. / Белорус.Сов. Эн-цикл. ; редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелСЭ, 1990.
5. Новиков, И. А. Становление и развитие военного факультета в БГУ: история и современность / И. А. Новиков, Е. Н. Пушенко // Веснік Бел. дзярж. ун-та. Сер. 3, Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. Права. – 2011. – № 3. – С. 28–31.
6. Турук, Ф. Университетская летопись / Ф. Турук // Труды Бел. гос. ун-та. – Менск, 1922. – № 1. – С. 175–208.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова